СТАТУТ

Раздзел I. Назва, мэты і юрыдычны адрас.

Артыкул 1

З зацвярджэннем назвы “АСАЦЫЯЦЫЯ БЕЛАРУСАЎ КАТАЛОНІІ РАЗАМ”/ "ASSOCIACIO RAZAM BIELORUSSOS DE CATALUNYA" (у далейшым "Асацыяцыя") ствараецца гэты суб'ект, які рэгулюе сваю дзейнасць у адпаведнасці з палажэннямі Закона 4/2008 ад 24 красавіка, змешчанага ў трэцяй кнізе грамадзянскага кодэкса Каталоніі адносна юрыдычных асоб; Арганічны закон 1/2002 ад 22 сакавіка, які рэгулюе права на асацыяцыі і іх статуты.

Артыкул 2

Мэтамі Асацыяцыі з'яўляюцца:

а) Распаўсюджванне, развіцце і ажыўленне культурнага жыцця беларускай дыяспары ў Каталоніі, а таксама павышэнне ўзроўню грамадскай і сацыяльнай самаідэнтыфікацыі ўсіх удзельнікаў Асацыяцыі і іх асяроддзя.
б) Арганізацыя як мага большай колькасці спартыўных, культурных і грамадскіх мерапрыемстваў, карысных для ўсіх паплечнікаў Асацыяцыі і іх асяроддзя.
в) Распаўсюджванне і садзейнічанне ўсебаковаму аднаўленню і падтрыманню культуры і традыцый беларускага народа.

Для дасягнення сваіх мэтаў Асацыяцыя ажыццяўляе наступныя мерапрыемствы:

а) Падтрымлівае і пашырае, наколькі гэта магчыма,
свае дакументальныя і бібліяграфічныя фонды, у асноўным за
кошт выпрацоўвання ўласнай прадукцыіі, напрыклад, выдання часопісаў альбо брашур, правядзення мастацкіх выстаў, а таксама
збору ахвяраванняў ад прыватных асобаў, арганізацый і ўстаноў.

б) Арганізоўвае мерапрыемствы па распаўсюджванні культурных, фальклорных і традыцыйных звычаяў беларускага народа.

в) Забяспечвае ўмовы для актыўнага адпачынку з мэтай непасрэднага кантакту з прыродай і аховы навакольнага асяроддзя.
г) Арганізоўвае і распаўсюджвае культурную дзейнасць розных відаў, якая спрыяе большай інтэграцыі беларускай суполкі.
д) Вядзе дыялог з дзяржаўнымі ўстановамі ў пытаннях, якія ўяўляюць агульны інтарэс.
е) Супрацоўнічае з асацыяцыямі такога ж характару пры ажыццяўленні сумеснай дзейнасці, пакуль яна прыстасоўваецца да мэтаў непасрэдна самой Асацыяцыі.
ж) Асацыяцыя пакідае за сабой права звяртання да грамадскіх інстытутаў і яго вольнае выкарыстанне для ўсебаковай рэалізацыі сваіх мэтаў.

з) Асацыяцыя зацвярджае фонд з уласных гуманітарных і эканамічных рэсурсаў, пры ўмове наяўнасці апошніх, для дасягнення мэтаў, згаданых у гэтым артыкуле.
і) Ажыццяўляе любую іншую дзейнасць у адпаведнасці з гэтым Статутам.

Усе матывы прыбытку выключаны.

Артыкул 3.

1. Асацыяцыя створана ў Барселоне і знаходзіцца па адрасе Calle Ronda Universitat, 9/20, 4-2, 08007.
2. Функцыі Асацыяцыі выконваюцца ў асноўным у Каталоніі.

Раздзел II. Удзельнікі Асацыяцыі, іх правы і абавязкі.

Артыкул 4.1

Усе фізічныя і юрыдычныя асобы, якія свабодна і добраахвотна зацікаўлены ў дасягненні мэтаў Асацыяцыі, могуць стаць яе ўдзельнікамі.

У дачыненні да фізічных асоб патрабуецца:

1. Быць дзеездольным.
2. Непаўналетнія ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў павінны мець згоду бацькоў або апекуноў, аднак, ў ніякім выпадку не могуць быць абранымі ў Кіруючую Раду.
3. Непаўналетнія да 14 гадовага ўзросту могуць набыць статус удзельніка Асацыяцыі і карыстацца правамі, якія з яго вынікаюць, праз сваіх законных прадстаўнікоў.

У дачыненні да юрыдычных асоб:
1. Запыт на ўваходжанне ў Асацыяцыю павінен быць зацверджаным кампетэнтным органам.
2.Нормы, якімі рэгулююецца дадзеная юрыдычная асоба, не павінны ісці ў разрэз з магчымасцю яе ўдзелу ў Асацыяцыі.

Каб уступіць у Асацыяцыю, трэба накіраваць пісьмовы запыт у Кіруючую Раду, якая павінна прыняць адпаведнае рашэнне на першым жа пасяджэнні пасля яго атрымання і агучыць вынік на бягучым Агульным Сходзе.

Артыкул 5

Правы ўдзельнікаў Асацыяцыі:

1. Прысутнічаць і галасаваць на пасяджэннях Агульнага Сходу.
2. Абіраць альбо быць абраным на пасады прадстаўнікоў, выконваць кіруючыя функцыі.

3. Прадстаўляць Асацыяцыю ў суаднесенасці з кожным канкрэтным выпадкам.
4. Удзельнічаць у працы Кіруючай Рады, кантраляваць дзейнасць Асацыяцыі ў адпаведнасці з заканадаўчымі нормамі і Статутам.
5. Звяртацца да Агульнага Сходу і Кіруючай Рады з прапановамі і ўсім тым, што можа паспрыяць развіццю як непасрэдна Асацыяцыі, так і павышэнню эфектыўнасці рэалізацыі яе асноўных сацыякультурных задач.
6. Запытваць і атрымоўваць тлумачэнні адносна Адміністрацыі і Кіруючай Рады, альбо іншых прадстаўнікоў Асацыяцыі.
7. Быць заслуханым перад прыняццем дысцыплінарных мер.
8. Атрымліваць інфармацыю аб дзейнасці Асацыяцыі.
9. Карыстацца агульнымі службамі, якія стварае Асацыяцыя альбо мае ў сваім распараджэнні.
10. Удзельнічаць у рабочых групах.
11. Мець копію Статута.
12. Кансультавацца з дакументацыяй Асацыяцыі.

Артыкул 6

Абавязкі ўдзельнікаў Асацыяцыі:

1. Прытрымлівацца мэтаў Асацыяцыі і актыўна ўдзельнічаць у іх дасягненні.
2. Садзейнічаць падтрымцы Асацыяцыі выплатамі ўзносаў, збораў і іншых фінансавых укладаў, устаноўленых Статутам і зацверджаных у адпаведнасці з ім.
3. Выконваць астатнія абавязацельствы, якія вынікаюць з заканадаўчых палажэнняў.
4. Падпарадкоўвацца і выконваць пагадненні, прынятыя кіраўнічымі органамі Асацыяцыі.

Артыкул 7

Формы і прычыны адлічэння з Асацыяцыі:

1. Асабістае рашэнне пакінуць арганізацыю, ў пісьмовым выглядзе адпраўленае на імя Кіраўнічай Рады.
2. Нявыплата ўстаноўленых узносаў.
3. Невыкананне прынятых абавязацельстваў.

Раздзел III. Агульны Сход

Артыкул 8

1. Агульны Сход -- гэта суверэнны орган Асацыяцыі, куды ўваходзяць у дабраахвотным парадку ўсе ўдзельнікі арганізацыі. Гэта права з'яўляецца неад'емным.
2. Члены Асацыяцыі на Агульным Сходзе, простай большасцю галасоў вырашаюць пытанні, якія ўваходзяць у кампетэнцыю гэтага органа.

3. Усе члены падпарадкоўваюцца дамоўленасцям Агульнага Сходу, у тым ліку адсутныя, нязгодныя ці ўстрымаўшыяся ад галасавання.

Артыкул 9

Агульны Сход мае наступныя паўнамоцтвы:

а) Сцвярджаць, калі гэта дастасавальна, працу Кіраўнічай Рады, бюджэт і гадавыя справаздачы.
б) Абіраць членаў Кіруючай Рады і кантраляваць іх дзейнасць.
в) Змяняць Статут.
г) Узгадняць форму і памер узносаў на фінансаванне Асацыяцыі альбо на аплату яе выдаткаў, уключаючы ўклады ў активы апошняй.
д) Сцвярджаць пераўтварэнні, зліцці, падзелы або роспуск Асацыяцыі.
е) Дамаўляцца аб прыняцці і выхадзе з федэрацый і канфедэрацый.
ж) Запытваць дэкларацыі аб камунальнай гаспадарцы.
з) Зацвярджаць унутраныя правілы і іх змены.
і) Ведаць заяўкамі, накіраванымі для ўдзелу ў Асацыяцыі, а таксама рэгістрацыяй выхаду з яе па ўсялякай прычыне, акрамя канчатковага скасавання арганізацыі.
к) Ратыфікаваць, калі патрэбна, дысцыплінарныя спагнанні і іншыя санкцыі, накладзеныя Кіраўнічай Радай.
л) Вырашаць пытанні, якія дакладна не аднесены да іншага кіраўнічага органа Асацыяцыі.

Артыкул 10

1. Агульны Сход праводзіцца на звычайнай сесіі не радзей аднаго разу ў год на працягу шасці месяцаў пасля даты закрыцця фінансавага года.
2. Кіруючы орган можа склікаць Агульны Сход з надзвычайным характарам кожны раз, калі дзеля гэтага есць падставы або не менш чым 10% удзельнікаў Асацыяцыі патрабуюць яго правядзення. У гэтым выпадку збор павінен быць праведзены на працягу трыццаці дзён пасля запыту.

Артыкул 11

1. Агульны Сход склікаецца кіраўнічым органам з дапамогай позвы, якая павінна змяшчаць як мінімум парадак дня, месца, дату і гадзіну пасяджэння.
2. Абвестка павінна быць выдадзена за пятнаццаць дзён да даты сустрэчы і ў пісьмовай форме накіравана індывідуальна на адрас кожнага ўдзельніка Асацыяцыі, згодна з лістом членства, які павінна мець арганізацыя.
3. Пасяджэнні Агульнага Сходу праходзяць пад старшынствам Прэзідэнта Асацыяцыі. У яго адсутнасці, абавязкі кіраўніка паслядоўна пераходзяць да віцэ-прэзідэнта альбо найстарэйшага члена Савета. Функцыі Сакратара выконвае тая ж асоба, якая займае адпаведную пасаду ў Кіруючай Радзе.
4. Сакратар вядзе пратакол кожнага пасяджэння і падпісвае яго разам з Прэзідэнтам. Пратакол павінен складацца з вытрымак развaжанняў

удзельнікаў, тэксту прынятых рэзалюцый, лікавага выніку галасавання і спісу прысутных.
У пачатку кожнага пасяджэння Генеральнай Асамблеі зачытваецца пратакол папярэдняй сесіі з мэтай зацвярджэння альбо ўнясення паправак. За пяць дзён да сходу, пратаколы і любая іншая дакументацыя павінны знаходзіцца ў адкрытым доступе ў агульных памяшканнях Асацыяцыі.

Артыкул 12

1.Агульны Сход з'яўляўецца дзейным органам незалежна ад колькасці зарэгістраваных, прысутных альбо прадстаўленых асоб.
2. 10% удзельнікаў могуць прапаноўваць Кіраўнічай Радзе ўключаць у парадак дня адно або некалькі пытанняў для абмеркавання.
У выпадку, калі Агульны Сход ўжо скліканы, ен можа адбыцца ў першай трэці перыяду паміж паступленнем закліку і датай, на якую прызначаны збор органа кіраўніцтва.
Агульны Сход можа прымаць пагадненні адносна пунктаў, унесеных у парадак дня, за выключэннем выпадкаў, калі ен мае ўніверсальны характар або калі пагадненне датычыцца склікання новага Агульнага Сходу.

Артыкул 13

1. На пасяджэннях Агульнага Сходу адзін голас адпавядае аднаму члену Асацыяцыі.
2. Дамоўленасці прымаюцца простай большасцю галасоў прысутных альбо прадстаўленых удзельнікаў.
3. Для прыняцця пагадненняў аб змене Статута, роспуску Асацыяцыі, утварэнні федэрацыі з аналагічнымі асацыяцыямі альбо інтэграцыі ў іншую, ўжо існуючую, распараджэнні альбо адчужэнні актываў, патрабуецца кваліфікаваная большасць удзельнікаў, прысутных альбо прадстаўленых (станоўчыя галасы павінны перавышаць палову ад выказаных). У любым выпадку, выбары Кіраўнічай Рады, калі прадстаўляюцца розныя кандыдатуры, праводзяцца па згодзе простай альбо адноснай большасці прысутных, альбо прадстаўленых членаў (больш галасоў "за", чым "супраць").
4. Кандыдатуры, якія афіцыйна прадстаўлены, маюць права на копію спісу ўдзельнікаў і іх адрасоў, а таксама адрасоў электроннай пошты, пры ўмове атрымання асабістага дазволу ад апошніх.

Раздзел IV. Кіраўнічая Рада.

Артыкул 14

1. Кіраўнічая Рада прадстаўляе і адмініструе Асацыяцыю. Гэты орган складаецца з Прэзідэнта, Віцэ-Прэзідэнта, Сакратара, Скарбніка і двух галосных. Пералічаныя пасады павінны займаць розныя людзі.

2. Выбары членаў Кіраўнічай Рады з ліку    паўналетніх членаў  Асацыяцыі, праводзяцца шляхам галасавання на Агульным Сходзе. Выбраныя  кандыдаты прыступаюць да выканання сваіх  абавязкаў  праз  прыняцце гэтай пасады.
3. Рашэнні аб прызначэнні альбо скасаванні пасад     павінны быць накіраваны  ў Рэестр Асацыяцыі ў форме пасведчання. Апошняе    выдаецца сакратаром  з адабрэння тагачаснага Прэзідэнта і павінна  ўключаць   акт аб прыняцці новага Прэзідэнта і новага Сакратара.
4. Члены Кіраўнічай Рады   выконваюць свае абавязкі бясплатна.

Артыкул 15

1. Члены Кіраўнічай Рады   займаюць пасаду на працягу пяці гадоў і маюць права на перавыбранне.
2. Прыпыненне выканання паўнамоцтваў Кіраўнічай Радай да заканчэння ўстаноўленага законам тэрміну   можа быць выклікана:

а) Смерцю альбо знікненнем без вестак, ў дачыненні да  фізічных асоб, альбо спыненнем  дзейнасці арганізацыі,  ў выпадку з юрыдычнымі асобамі.
б) Недзеяздольнасцю альбо дыскваліфікацыяй.
в) Адстаўкай, накіраванай у пісьмовай форме  кіраўнічаму органу.
г) Падзелам, узгодненым  Агульным Сходам.
д) Любой іншай прычынай, устаноўленай законам або Статутам.

3. Вакансіі, якія з'яўляюцца ў Кіраўнічай Радзе, павінны быць запоўнены на першай нарадзе Агульнага Сходу. Кожны  член Асацыяцыі можа часова займаць вакантную пасаду.

Артыкул 16

1. Кіраўнічая  Рада мае наступныя паўнамоцтвы:

а) Прадстаўляць, адміністраваць і накіроўваць Асацыяцыю ў самым шырокім парадку, замацаваным заканадаўчымі актамі арганізацыі.  Выконваць  рашэнні, прынятыя Генеральным Сходам,  у адпаведнасці з правіламі, інструкцыямі і рэкамендацыямі ім устаноўленымі.
б) Заключаць неабходныя пагадненні адносна зваротаў да  дзяржаўных органаў,  ажыццяўляць разнастайныя судовыя дзеянні   і выкарыстоўваць адпаведныя рэсурсы.
в) Патрабаваць ад  Агульнага  Сходу  абарону інтарэсаў Асацыяцыі.
г) Прапаноўваць Агульнаму Сходу  абараняць   фіксаваныя квоты, якія  члены Асацыяцыі павінны ўносіць.
д) Склікаць агульныя сходы і кантраляваць выкананне прынятых імі  рашэнняў.
е) Прадстаўляць на зацвярджэнне Агульнаму  Сходу баланс і справаздачу аб рахунках за кожны фінансавы год  і складаць бюджэт  на наступны.
ж) Наймаць супрацоўнікаў ад імя  Асацыяцыі.
з) Правяраць бухгалтэрыю і гарантаваць звычайны  рэжым работы Асацыяцыі.

і) Ствараць рабочыя групы для дасягнення мэт Асацыяцыі і сцвярджаць мерапрыемствы, якія плануюць ажыццяўляць азначаныя групы.
к) Прызначаць куратараў рабочых груп з членаў Кіраўнічай Рады.
л) Падтрымліваць сувязь з дзяржаўнымі органамі, арганізацыямі і фізічнымі асобамі для:

-атрымання субсідый або іншых форм дапамогі;
-выкарыстання памяшканняў або будынкаў, дзе можа размяшчацца суполка, а таксама цэнтр аднаўлення культуры і нацыянальнай еднасці.

м) Адкрываць разліковыя рахункі і ашчадныя кніжкі ў любой крэдытнай альбо ашчаднай установе і распараджацца сродкамі, якія там знаходзяцца. Нормы карыстання фінансамі Асацыяцыі вызначаны ў артыкуле 28.
н) Своечасова вырашаць любое здарэнне, сфера адказнасці за якое не зацверджана Статутам і даваць справаздачу аб ім на першым пасяджэнні Агульнага Схода.
о) Ажыццяўляць іншую дзейнасць, не прыпісаную пэўным чынам якому-небудзь іншаму кіраўнічаму органу Асацыяцыі.

Артыкул 17

1. Кіраўнічая Рада, папярэдне скліканая Прэзідэнтам, альбо асобай, якая яго замяняе, павінна збірацца на звычайныя сесіі з перыядычнасцю, якую вызначаюць яе члены, але ж ні ў якім выпадку не радзей за адзін раз у квартал.
2. Кіраўнічая Рада можа быць сабрана на пазачарговай сесіі, па заклiку Прэзідэнта, альбо па запыту трэці ўдзельнікаў, якія яе складаюць.

Артыкул 18

1. Кіраўнучая Рада лічыцца сапраўднай, калі яна склікаецца загадзя і пры наяўнасці кворуму ў палову плюс адзін з яе членаў.
2. Члены Кіраўнічай Рады абавязаны прысутнічаць на ўсіх пасяджэннях. Адсутнасць на пленумах павінна быць
падцверджана абгрунтаванымі прычынамі. Наяўнасць Прэзідэнта ці Сакратара альбо асоб, якія іх замяняюць, з'яўляецца заўседы неабходнай.
3. Кіраўнічая Рада прымае дамоўленасці простай большасцю галасоў
усіх удзельнікаў.

Артыкул 19

1. Кіраўнічая Рада мае права дэлегаваць любыя свае паўнамоцтвы аднаму альбо некалькім камітэтам ці рабочым групам, калі будуць атрыманы дзве
трацiны станоўчых галасоў.
2. Кіраўнічая Рада таксама можа прызначыць з адным і тым жа кворумам аднаго або некалькіх прадстаўнікоў для выканання ўскладзеных на іх функцый і паўнамоцтваў, якія яна лічыць патрэбнымі ў кожным выпадку.

3. Застаюцца нязменным абавязкам Кіраўнічай Рады справаздачы альбо акты, якія павінны быць зацверджаны Агульным Сходам.

Артыкул 20

Пагадненні Кіраўнічай Рады павінны быць зафіксаваны ў пратаколе і падпісаны Сакратаром і Прэзідэнтам. У пачатку кожнага пасяджэння пратакол папярэдняй сесіі павінен быць зачытаны для зацвярджэння альбо выпраўлення, калі гэта неабходна.

Раздзел V. Прэзідэнт і Віцэ-прэзідэнт.

Артыкул 21

1. Прэзідэнту належаць наступныя функцыі:
а) Адкрыта і законна прадстаўляць Асацыяцыю шляхам дэлегацыі яму паўнамоцтваў ад Генеральнага Сходу і Кіраўнічай Рады.
б) Старшынстваваць і кіраваць дэбатамі як Генеральнага Сходу, так і Кіраўнічай Рады.
в)Вымаўляць рашаючы галас у выпадку роўнага галасавання.
г) Забяспечваць скліканне пасяджэнняў Генеральнага Сходу і Кіраўнічай Рады.
д) Сцвярджаць пратаколы і пасведчанні, складзеныя Сакратаром Асацыяцыі.
е) Выконваць астатнія абавязкі, уласныя паўнамоцтвам Прэзідэнта, якія яму дэлегуе Генеральны Сход і/ці Кіраўнічая Рада.
2. У выпадку адсутнасці/хваробы Прэзідэнта яго замяшчае Віцэ-прэзідэнт, альбо найстарэйшы член Рады.

Раздзел VI. Казначэйства і Сакратар

Артыкул 22

Функцыя Скарбніка - захаванне і кантроль рэсурсаў Асацыяцыі, а таксама падрыхтоўка бюджэту, балансу і разлікаў. Вядзенне касавай кнігі. Падпісанне квітанцый аб узносах і іншых казначэйскіх дакументаў. Аплата рахункаў, зацверджаных Кіруючай Радай і ўзгодненых папярэдне з Прэзідэнтам, залічэнне астаткаў на адкрытыя дэпазіты ў крэдытных альбо ашчадных установах.

Артыкул 23

Сакратар павінен ахоўваць дакументацыю Асацыяцыі, збіраць, весці і падпісваць пратаколы пасяджэнняў Генеральнага Сходу і Кіраўнічай Рады, выпрацоўваць сертыфікаты, якія выдаюцца, а таксама весці кнігу ўліку ўдзельнікаў.

Раздзел VII. Камісіі або рабочыя групы.

Артыкул 24

Стварэнне і склад любой камісіі або рабочай групы павінны быць прапанаваны членамі Асацыяцыі, якія стануць іх непасрэднымі удзельнікамі, з наступным паведамленнем і тлумачэннем сутнасці запланаваных мерапрыемстваў Кіраўнічай Радзе.
Кіраўнічая Рада павінна аналізаваць дзейнасць створаных камісій або працоўных груп, а кіраўнікі апошніх павінны прадстаўляць падрабязную справаздачу раз на месяц.

Раздзел VIII. Эканамічны ўклад.

Артыкул 25

Эканамічныя рэсурсы Асацыяцыі забяспечваюцца:

а) Узносамі, устаноўленымі Агульным сходам.
б) Афіцыйнымі альбо прыватнымі субсідыямі.
в) Ахвяраваннямі, рэнтай або спадчынай.
г) Даходамі ад уласных актываў або іншымі паступленнямі, якія могуць быць атрыманы.

Артыкул 26

Усе члены Асацыяцыі абавязаны падтрымліваць яе фінансава праз узносы або зборы, у парадку і ў прапорцыі, вызначанай Агульным Сходам па прапанове Рады.

Дырэктыва.

Агульны Сход можа ўсталёўваць плату за ўступленне і іншыя перыядычныя зборы, якія выплачваюцца па месяцах, кварталах ці семестрах, у адпаведнасці з тым, што прадугледжана Кіраўнічай Радай, а таксама надзвычайныя ўнёскі.

Артыкул 27

Фінансавы год супадае з каляндарным і закрываецца 31 снежаня.

Артыкул 28

У разліковых рахунках ці ашчадных кніжках, адкрытых у банкаўскіх установах, павінны быць подпісы Прэзідэнта, Скарбніка і Сакратара.
Для распараджэння сродкамі дастаткова двух подпісаў, адзін з якіх павінен належыць Скарбніку альбо Прэзідэнту.

Раздзел IX. Дысцыплінарныя спагнанні.

Артыкул 29

Кіраўнічы орган можа санкцыянаваць парушэнні, учыненыя ўдзельнікамі Асацыяцыі.
Гэтыя парушэнні можна класіфікаваць як нязначныя, сур'ёзныя і вельмі сур'ёзныя. Такім чынам, санкцыі могуць вар'іравацца ад папярэджання да выключэння з Асацыяцыі, у адпаведнасці з тым, што сцверджана ўнутранымі правіламі.
Працэдура санкцый распачынаецца ў выніку скаргі альбо паведамлення. На працягу 10 дзён Кіраўнічая Рада прызначае інструктара, які разглядае санкцыйную справу і за наступныя 15 дзён прапануе пастанову з папярэднім слуханнем меркаванага правапарушальніка. Канчатковая рэзалюцыя, якую павінны матываваць і прыняць дзве траціны членаў Кіруючай Рады, сцвярджаецца гэтым органам таксама на працягу 15 дзён.
У выпадках накладання санкцый за вельмі сур'ёзныя правапарушэнні, узгодненых Кіраўнічай Радай, зацікаўленыя асобы могуць запытаць ратыфікацыю спагнанняў да першага Агульнага Сходу, які мае месца адбыцца.

Раздзел X. Роспуск Асацыяцыі.

Артыкул 30

Асацыяцыя можа быць распушчана па згодзе, дасягнутай на Агульным Сходзе, скліканым з надзвычайным характарам і спецыяльна для гэтай мэты.

Артыкул 31

1. Пасля ўзгаднення роспуску, Агульны Сход павінны прыняць адпаведныя меры як адносна прызначэння маёмасці і правоў Асацыяцыі, так і меры ліквідацыі ўсіх аперацый, якія могуць існаваць.

2. Агульны Сход мае права выбіраць ліквідацыйную камісію кожны раз, калі палічыць патрэбным.
3. Члены Асацыяцыі вызваляюцца ад асабістай адказнасці. Іх адказнасць абмяжоўваецца выкананнем абавязацельстваў, якія яны самі добраахвотна прызнаюць.
4. Чысты астатак у выніку ліквідацыі павінен быць перададзены непасрэдна дзяржаўнаму або прыватнаму некамерцыйнаму прадпрыемству, якое ў тэрытарыяльнай сферы дзейнасці Асацыяцыі больш вылучаецца ў сваёй дзейнасці на карысць дабрачынных прац.

5. Функцыі ліквідацыі і выканання пагадненняў, згаданых у папярэдніх раздзелах гэтага артыкула, выконваюць Кіраўнічая Рада, у выпадку, калі Агульны Сход не даручае гэтую місію ліквідацыйнай камісіі, спецыяльна прызначанай для гэтай мэты.

БАРСЕЛОНА, 8 ВЕРАСНЯ 2020г.